СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



Чаму мы мала ведаем пра блізкіх суседзяў?



Чаму Ганчарэнку звольнілі з «Кубані»?

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛІСТАПАДА 2014 г. АЎТОРАК № 218 (27828) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Хадзі і любуйся

*У Віцебску з'явіўся першы надземны пераход праз ажыўленую дарогу. Канструкцыя са шкла і металу даўжынёй 40 метраў, што з'явілася ў новым мікрараёне Білёва, можа ў хуткім часе стаць «разыначкай» для спакушаных турыстаў фестывальнага горада. Бо тут можна ў поўнай бяспецы паглядзець на віцебскія новабудоўлі з прыстойнай вышыні. Прычым у любое надвор'е — ні снег, ні вецер пад надзейным купалам не страшныя.*



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай СНАПКОЎ, міністр эканомікі:**

*«У Беларусі няма фундаментальных прычын для паскарэння тэмпаў зніжэння кошту нацыянальнай валюты, як у краінах — асноўных гандлёвых партнёрах, напрыклад, у Расіі. Для нашай эканомікі гэта не дасць станоўчага эфекту. Эфект дэвальвацыі на эканоміку ў цэлым роўны нулю, а па асобных галінах — мінус. Асабліва па тых, што працуюць на ўнутраны рынак. Больш хуткая ў параўнанні з Беларуссю дэвальвацыя нацыянальнай валюты ў Расіі адбіваецца на некалькіх прадпрыемствах машынабудаўнічай галіны, для якіх расійскі рынак — асноўны рынак збыту. Але з-за гэтых прадпрыемстваў рабіць дэвальвацыю паскоранымі тэмпамі пры адсутнасці фундаментальных прычын мы не лічым правільным. На погляд Мінэканомікі, у гэтым плане палітыка Нацыянальнага банка з'яўляецца абсалютна прагматычнай і справядлівай».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.11.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10770,00 | ▲ |
| Еўра | 13490,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 227,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 693,54 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

■ Гасцёўня «Звязды»

## «НЕ РАБІЦЕ ТАГО, ЧАГО НЕ ЖАДАЛІ Б САБЕ...»

Генеральны дырэктар магілёўскага ААТ «Магатэкс» Віктар Мацievіч — пра тое, што агульнага паміж музыкай і камерцыяй, чым карысная канкурэнцыя і як прывабіць замежны бізнес.

**Ён з поспехам мог стаць музыкантам, спартсменам, бізнесменам, але застаўся працаваць на прадпрыемстве, якое пасля развалу Савецкага Саюза магло знікнуць зусім. Сёння гэта цалкам мадэрнізаваная вытворчасць, якая паспяхова экспартуе сваю прадукцыю больш чым у 20 краін свету.**

### ДЗЯРЖСЛУЖАЧЫ З АМБІЦЫЯМІ БІЗНЕСМЕНА

**— Мала хто з кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў можа пахваліцца, што ўяўляе інтарэс для замежнага бізнесу. Як гэта ў вас атрымліваецца? — пацікавілася я ў Віктара Мацievіча пры сустрэчы.**

— Сёння кожны кіраўнік павінен быць бізнесменам. Сваім партнёрам мы даём зразумець, што хоць наша прадпрыемства на 98% дзяржаўнае, але яны да нас прыехалі па бізнесе. Па-іншаму нельга працаваць ва ўмовах рынкавых зносін. Новае абсталяванне, тэхналогіі дазваляюць павялічваць аб'ёмы і такім чынам выходзіць на Еўрасаюз.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## Даставайце шапкі і рукавіцы

**У аўторак тэрыторыя нашай краіны будзе на ўскрайку халоднага антыцыклону з цэнтрам над Сярэдняй Волгай. Таму надвор'е чакаецца пераважна сухое, толькі месцамі па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях чакаюцца невялікія апады (галоўным чынам дождж), паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**



Магчымы слабы галалёд. Максімальная тэмпература паветра ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. У сераду і чацвер у паўднёва-заходніх рэгіёнах краіны пачне гаспадарыць атмасферны фронт. Там чакаецца дождж і мокры снег. Месцамі галалёд. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, па паўночным усходзе — да 7 марозу. Удзень — мінус 2 — плюс 4 градусы. І ў пятніцу характар надвор'я істотна зменіцца. Мокры снег і дождж будуць ужо і на захадзе краіны. Паўсюдна чакаюцца галалёдныя з'явы. Тэмпература паветра ўначы на пятніцу будзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, на ўсходзе пры праясненнях — 6-8 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 2 да плюс 3 градусаў. Хутка зіма...

**Сяргей КУРКАЧ.**